кай магіле чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1939; на могілках сав. воінаў і партызан; на могілках і магілах ахвяр фашызму, што загінулі ў Вял. Айч. вайну; Курган Бессмяротнасці, насыпаны на ўшанаванне памяці Міцкевіча. У Н. створаны рукапісны помнік пач. 16 ст.— *Навагрудскі пралог.* Прадугледжана расшырэнне прамысл. зоны, вылучэнне ахоўных гіст. зон, стварэнне спарт. цэнтра ў паўн. частцы, азеляненне гар. тэрыторыі.

На паўд.-зах. ускраіне Н., ва ўрочышчы Батароўка выяўлены курганны могільнік 12—13 ст. славяна-балцкага насельніцтва (55 насыпаў вышынёй 0,3—1 м, дыяметрам 3—4 м з пахавальным абрадам трупапалажэння). Іл. гл. таксама на ўкл.

*Літ.:* Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок.— Л., 1981; Казачонак І. Навагрудак.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1970. № 4.

*А. П. Грыцкевіч* (гісторыя), *С. Ф. Самбук* (сучасная архітэктура).

**НАВАГРУДСКАЯ БАРЫСАГЛЕБСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры пач. 16 ст. Пабудавана ў стылі готыкі ў 1517 (паводле інш. звес-



Навагрудская Барысаглебская царква. З малюнка 19 ст.

так закончана ў 1519) у Навагрудку на месцы стараж. храма 2-й пал. 12 ст., складзенага полацкімі дойлідамі з вапняковых квадратаў і плінфы (3-апсіднага, з трох бакоў абкружанага галерэяй), фрагмент сцяны якога стаў часткай фундамента царквы. Спачатку была 4-слуповым збудаваннем зальнага тыпу (асн. аб'ём у плане блізкі да квадрата са стараной каля 14 м) з 5-граннай алтарнай апсідай, зорчатымі нервюрнымі скляпеннямі, стральчатымі вокнамі і высокім шчытавым дахам. У 1932 разабрана зах. сцяна і дабудаваны 2-вежавы гал. фасад. План царквы набыў выгляд прамавугольніка. Вежы (прамавугольныя ўнізе і 8-гранныя ўверсе) былі прыстасаваны да абароны, мелі вузкія байніцы і завяршаліся зубцамі. У 19 ст. прыбудаваны прытвор, зменены завяршэнні вежаў.

Сцены ўмацаваны 6-граннымі контрфорсамі, аздоблены тонкімі лапаткамі і 3-радовым поясам стральчатых арачак пад карнізам, выкананых з прафіляванай цэглы. Ахоўваецца дзяржавай. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Дэкор* у архітэктуры і ў арт. *Готыка.*

*Літ.:* Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии.— Мн., 1969. с. 63—66; Каргер М. К. Раскопки храма Бориса и Глеба в Новогрудке.— У кн.: Археологические открытия 1965 года. М., 1966.

*Г. І. Барышаў.*

**НАВАГРУ́ДСКАЯ КА́ФЛЯ**, архітэктурна-дэкаратыўная кераміка 14—17 ст. з Навагрудка. Падзяляецца на гаршковую 14—16 ст. і каробчатую 16—17 ст. (тэракотавую і зялёную паліваную). Паводле прызначэння падзяляецца на сценную, карнізную, фрызавую, вуглавую, а таксама «каронкі» і «гарадкі», якімі завяршалі печы. У 14 ст. выраблялі кафлю з цыліндрычным тулавам і круглым вусцем; у 15 ст.— гаршковую кафлю з крыжападобным, сэрцападобным і трохвугольным вусцем; у 15—16 ст.— невысокую гаршковую кафлю з прамавугольным вусцем і дном, аздобленым рэльефнымі кругамі. Кафля 16—17 ст. мае прамавугольную вонкавую пласціну з рамкай па краі і румпу вышынёй 7—9 см. У дэкоры вы-



Навагрудская кафля канца 16— пач. 17 ст.: з геральдычным малюнкам (уверсе) і карнізная.

РЭПОЗІТОРЫЙ ГГУКІ

карыстаны геаметрычны (квадраты, ламаныя лініі), раслінны (званочкі, валошкі, ружы, рамонкі), геральдычны (гербы і манаграмы ўладальнікаў) арнаменты, выявы анёлаў, грыфонаў і інш. На кафлі 17 ст. пашыраны «дывановы» арнамент са стылізаваным раслінным узорам. Іл. гл. таксама ў арт. *Грыфон.*

*Літ.:* Овсянников О. В. Архитектурно-декоративная керамика XVI—XVII вв. из Новогрудка.— Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Ин-та археологии АН СССР, 1969, в. 120; Панічава Л. Р. Навагрудская кафля.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1980, № 2.

*А. А. Трусаў.*

**НАВАГРУ́ДСКАЯ РА́ТУША.** Існавала ў 17—19 ст. Была пабудавана ў 1660-я г. ў стылі барока на гандлёвай плошчы. Мураваная 2-павярховая П-падобная ў плане з 2-яруснай шматграннай вежай, завершанай скульптурнай выявай архангела Міхаіла.

Пры рэканструкцыі 1739 і 1818 зменены планіроўка, колькасць дзвярных і аконных праёмаў. На фасадзе, арыентаваным на плошчу, на ўзроўні 2-га паверха зроблена галерэя на 4 калонах. Лаканічныя фасады набылі элементы стылю класіцызму (абрамленні аконных і дзвярных праёмаў, рустоўка па вуглах будынка і на гранях вежы на ўзроўні 1-га паверха, нішы на 2-м паверсе). Н. р. разабрана ў 1870-я г. *С. П. Саітгарэева.*

**НАВАГРУ́ДСКІ «ДОМ БАЯ́РЫНА».** Існаваў у 12 ст. на тэр. вакольнага горада Навагрудка. Пабудаваны з дрэва і цэглы. Прамавугольны ў плане будынак пл. каля 76 $м^2$ унутры падзяляўся сцяной на 2 памяшканні, меў зашклёныя вокны. У паўн.-ўсх. куце была глінабітная печ. У цэнтры стаяў слуп, які трымаў перакрыцце. Рэшткі будынка выяўлены ў пач. 1960-х г. пры археал. раскопках.

Драўляныя сцены знутры былі абчасаны, атынкаваны і аздоблены фрэскамі. Сюжэты фрэсак — геам. і раслінныя выявы ярка-чырвонага, чырвона-карычневага і чорнага колераў, акаймаваныя паўкруглымі і інш. формы бардзюрамі. Фоны — белы і бледна-зялёны. Сярод знойдзеных фрагментаў фрэсак выява мужч. галавы ў профіль у княжацкай шапцы з карычневай апухай. Фрэска выканана ў чырвона-карычневых тонах на бела-жоўтым фоне. Знойдзены таксама фрагменты фрэсак з старажыт.-рус. літарамі і *графіці.*

*Літ.:* Гуревич Ф. Д. Дом боярина XII в. в древнерусском Новогрудке.— Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Ин-та археологии АН СССР, 1964, в. 99; яе ж. Древний Новогрудок.— Л., 1981, с. 36—44, 121—122.

**НАВАГРУ́ДСКІ КАСЦЁЛ І КЛЯ́ШТАР ФРАНЦЫСКА́НЦАЎ,** помнік архітэктуры 2-й пал. 18 — 2-й пал. 19 ст. Комплекс пабудаваны ў Навагрудку ў стылі позняга барока. Касцёл (1780, перабудаваны ў 1846 у псеўдавізантыйскім стылі, вядомы як Мікалаеўская царква) — 3-нефавая мураваная базіліка з 5-граннай алтарнай апсідай. Гал. фасад падзелены развітымі антаблементамі на 3 ярусы. У цэнтры 1-га яруса абапал гал. ўвахода 2 спараныя пілястры. У цэнтры 2-га яруса размешчана высокае паўцыркульнае акно, якое абрамляюць пілястры. 2 ніжнія завершаны шырокім прафіляваным карнізным пояском. 3-і ярус — невысокая вежа-званіца з купалком на 8-гранным барабане. У яе бакавых частках паўцыркульныя аконныя праёмы, у сярэдняй, дзе знаходзяцца званы, — арачны праём. Сцены цэнтр. нефа расчлянёны пілястрамі, сцены бакавых прарэзаны высокімі



Навагрудскі касцёл і кляштар францысканцаў. Выгляд касцёла з боку апсіды.

аконнымі праёмамі, размешчанымі па 2 узроўнях. Вокны з лучковымі і паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі зашклёны вітражамі.

Унутры цэнтр. неф перакрыты паўцыркульным з распалубкамі скляпеннем на падпружных арках. У тоўшчы сцяны гал. фасада 2 вінтавыя лесвіцы вядуць на званіцу. На Пн ад касцёла асобна стаіць 2-павярховы Г-падобны ў плане мураваны корпус кляштара. Будынак вырашаны ў лаканічных формах: гал. фасад (з уваходам у цэнтры) рытмічна прарэзаны прамавугольнымі вокнамі. На паўд. тарцовым фасадзе размешчана вонкавая мураваная лесвіца, агароджаная падпорнай сценкай, якая ўмацавана масіўным контрфорсам. Корпус кляштара калідорнай планіроўкі з 1-баковым размяшчэннем жылых памяшканняў перакрыты масіўнымі крыжовымі скляпеннямі. У зах. частцы корпуса некалькі пакояў маюць цыліндрычныя скляпенні на распалубках. Выкарыстоўваецца як жылы будынак. Будынак кляштара ахоўваецца дзяржавай. *Т. І. Чарняўская, А. А. Ярашэвіч.*

**НАВАГРУ́ДСКІ МАЛЫ́ ЗА́МАК,** гл. ў арт. *Навагрудскія замкі.*

**НАВАГРУ́ДСКІ МІХА́ЙЛАЎСКІ КАСЦЁЛ ДАМІНІКА́НЦАЎ,** помнік архітэктуры 1-й пал. 18 ст. Пабудаваны ў Навагрудку ў стылі сталага барока, адноўлены пасля пажараў у 1751 і 1831, мае элементы стылю класіцызму. 2-ярусная мураваная званіца пабудавана ў 1829. Мураваная 3-нефавая базіліка з плоскім бязвежавым гал. фасадам і паўцыркульнай алтарнай апсідай. Гал. фасад падзелены развітымі карнізамі на 2 ярусы і завершаны трохвугольным франтонам з вежачкай над ім.



Навагрудскі Міхайлаўскі касцёл дамініканцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ